**Журнал Белорусского государственного университета. История. 2022;2:20–29**
**Journal of the Belarusian State University. History. 2022;2:20–29**

*УДК 272:930.251:930.255*

# АРХИВЫ ОРГАНОВ ЕПАРХИАЛЬНОГО УПРАВЛЕНИЯ ХРИСТИАНСКИХ КОНФЕССИЙ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В КОНЦЕ XVIII – НАЧАЛЕ XX в.

***З. В. АНТОНОВИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Проводится компаративный анализ организации деятельности архивов органов административно-территориального управления и духовного суда христианских конфессий, действовавших на белорусских землях в конце XVIII – начале XX в. На основании изменений в нормативном регулировании выделяются два общих периода в развитии архивов православных, униатских, римско-католических, протестантских консисторий и Литовского синода. Эти периоды связаны с принятием Устава духовных консисторий для православной церкви, а также с разработкой инструкций по делопроизводству консисторий для инославных церквей в 1840-х гг. Отмечается, что второй период для каждой консистории можно разделить на этапы в соответствии с развитием конфессионального управления в сфере делопроизводства и архивного дела. На широкой источниковой основе делается вывод о том, что архивное дело в органах конфессионального управления христианских конфессий в конце XVIII – начале XX в. в целом соответствовало действующему законодательству Российской империи, за исключением отдельных аспектов для каждого из периодов, а внимание руководства конфессий и научной общественности XIX – начала XX в. позволило сохранить отдельные объемные документальные комплексы с высоким информационным потенциалом, что открывает значительные возможности для диверсификации научных исследований в проблемной области.

***Ключевые слова:*** консистория; архив консистории; архив православной консистории; архив римско-католической консистории; архив униатской консистории; архивы евангелических церквей; архивариус.

# АРХІВЫ ОРГАНАЎ ЕПАРХІЯЛЬНАГА КІРАЎНІЦТВА ХРЫСЦІЯНСКІХ КАНФЕСІЙ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

***З. В. АНТАНОВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Праводзіцца кампаратыўны аналіз арганізацыі дзейнасці архіваў органаў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда хрысціянскіх канфесій, якія дзейнічалі на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. На падставе змен у нарматыўным рэгуляванні выдзяляюцца два перыяды развіцця архіваў праваслаўных, уніяцкіх, рымска-каталіцкіх, пратэстанцкіх (евангелічных) кансісторый і Літоўскага сінода. Гэтыя перыяды звязаны з прыняццем Статута духоўных кансісторый для праваслаўнай царквы, а таксама з распрацоўкай інструкцый па справаводстве кансісторый для інаслаўных цэркваў у 1840-я гг. Адзначаецца, што другі перыяд для кожнай кансісторыі можа быць падзелены на этапы ў адпаведнасці з развіццём канфесіянальнага кіраўніцтва ў галіне справаводства

**Образец цитирования:**
Антановіч ЗВ. Архівы органаў епархіяльнага кіраўніцтва хрысціянскіх канфесій на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2022;2:20–29.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2022-2-20-29

**For citation:**
Antonovich ZV. Archives of dioeces bodies of Christian confessions in Belarus in the late 18th – early 20th century. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2022;2: 20–29. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2022-2-20-29

**Автор:**
***Зинаида Васильевна Антонович*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры источниковедения исторического факультета.

**Author:**
***Zinaida V. Antonovich***, PhD (history), docent; associate professor at the department of source studies, faculty of history.
*zinantonowicz@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0003-0702-1915*



CC BY NC

і архіўнай справы. Абапіраючыся на мноства крыніц, аўтар прыходзіць да высновы аб тым, што архіўная справа ў органах канфесіянальнага кіраўніцтва хрысціянскіх канфесій у канцы XVIII – пачатку XX ст. пераважна адпавядала дзеючаму заканадаўству Расійскай імперыі, за выключэннем асобных аспектаў для кожнага з перыядаў, а ўвага кіраўніцтва канфесій і навуковай грамадскасці XIX – пачатку XX ст. дазволіла захаваць асобныя значныя дакументальныя комплексы высокага інфармацыйнага патэнцыялу, што адкрывае значныя магчымасці для дыверсіфікацыі навуковых даследаванняў у праблемнай галіне.

***Ключавыя словы:*** кансісторыя; архіў кансісторыі; архіў праваслаўнай кансісторыі; архіў рымска-каталіцкай кансісторыі; архіў уніяцкай кансісторыі; архівы евангелічных цэркваў; архіварыус.

# ARCHIVES OF DIOECES BODIES OF CHRISTIAN CONFESSIONS IN BELARUS IN THE LATE 18th – EARLY 20th CENTURY

***Z. V. ANTONOVICH*** [a]

[a] *Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The author of the article conducts a comparative analysis of the organisation of the archives of the bodies of administrative-territorial leadership and the spiritual court of Christian denominations in the Belarusian lands in the late 18th – early 20th century. Based on the changes in the regulations, two general periods of development of the consistory' archives and the Lithuanian Synod are distinguished. It's connected with the development of the Statute of spiritual consistories for Orthodox and instructions on the records management of consistories for other Christian denominations based on first mentioned in the 1840s. The second period can be divided into stages according to the development of the confessional leadership of each of the confessions. Based on a wide source, the author of the article concludes that archives in the bodies of the confessional leadership of Christian denominations in the late 18th – early 20th century corresponded to the legislation of the Russian Empire, and the attention of the confessional leadership and the scientific community of the 19th – early 20th century allowed to preserve significant documentary complexes of high information potential. The results would help expand the source base and diversify scientific research.

***Keywords:*** consistory; archive of the consistory; archive of the Orthodox consistory; archive of the Roman Catholic consistory; archive of the Greek Catholic consistory; archives of the Evangelic churches; archivist.

## Уводзіны

Гісторыя беларускай архіўнай справы выклікае цікавасць сучасных навукоўцаў. Развіццё нарматыўнага рэгулявання захоўвання дакументаў і адпаведнасць яму дзейнасці архіваў арганізацый, камплектаванне, улік і апісанне спраў дазваляюць ацаніць інфармацыйны патэнцыял архіўных фондаў арганізацый, уключаных у склад Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь, і пашырыць крыніцавую базу даследаванняў. Сярод такіх дакументальных комплексаў вылучаюцца матэрыялы дзейнасці органаў епархіяльнага кіраўніцтва хрысціянскіх канфесій канца XVIII – пачатку XX ст. Гэтыя органы займалі значнае месца на грамадска-палітычнай арэне Расійскай імперыі. Для некаторых іншаслаўных канфесій яны з'яўляліся выключнымі ў сусветнай практыцы, а асобныя з іх пакінулі аб'ёмную дакументальную спадчыну.

У Расійскай імперыі фарміраванне структуры епархіяльнага кіраўніцтва пачынаецца з рэформ Пятра I, у выніку якіх была створана Маскоўская духоўная дыкастэрыя. Праз 20 гадоў яна будзе пераўтворана ў кансісторыю і стане ўзорам для арганізацыі органаў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда не толькі ў праваслаўных епархіях, але і ў аналагічных адзінках іншых хрысціянскіх канфесій [1, с. 126–137]. Пры гэтым, калі ў першай трэці XVIII ст. нарматыўнымі актамі былі рэгламентаваны функцыі і паўнамоцтвы кансісторый, архіўная справа ў іх засяроджвалася на вызначэнні штатаў і фармуляванні агульных патрабаванняў да забеспячэння захаванасці матэрыялаў дзейнасці, а падзаконныя нарматыўныя і метадычныя дакументы агульнадзяржаўнага характару адсутнічалі. Шэраг даследчыкаў адзначаюць, што ў адрозненне ад архіва Сінода, які аформіўся ў 1738 г. [2, с. 23], кансісторскія архівы XVIII ст. былі слаба ўпарадкаванымі, а пасада архіварыуса адсутнічала, у тым ліку ў Маскоўскай і Наўгародскай кансісторыях [3; 4], фарміраванне ж архіваў кансісторый і Літоўскага евангелічна-рэфарматарскага сінода (далей – Літоўскі сінод), юрысдыкцыя якіх ахоплівала тэрыторыю сучаснай Беларусі, пакуль застаецца мала даследаванай. Адпаведна, мэтай гэтай работы з'яўляецца

параўнанне арганізацыі архіваў у органах епархіяльнага кіраўніцтва хрысціянскіх канфесій. Гэта патрабуе вылучэння спецыфікі дзейнасці архіваў згаданых органаў шляхам параўнання іх нарматыўнага рэгулявання, а таксама кампаратыўнага аналізу падыходаў да іх кадравага забеспячэння, камплектавання, уліку, стварэння даведачнага апарату і выкарыстання, фактараў захаванасці матэрыялаў дзейнасці (умоў фізічнага захоўвання, перамяшчэння архіваў, правядзення экспертызы каштоўнасці дакументаў і інш.). Акрамя таго, выклікае цікавасць уплыў вышэйшага кліру на арганізацыю архіваў згаданых органаў. Тэрытарыяльныя межы даследавання абумоўлены юрысдыкцыяй органаў епархіяльнага кіраўніцтва, якім падпарадкоўваліся прадстаўніцтвы канфесій на беларускіх землях пасля падзелаў Рэчы Паспалітай.

## Метадалогія даследавання

Цэласныя комплексы матэрыялаў дзейнасці органаў епархіяльнага кіраўніцтва хрысціянскіх канфесій на беларускіх землях не захаваліся, што патрабуе ад сучаснага даследчыка ажыццяўляць ацэнку рэпрэзентатыўнасці захаванай спадчыны для правядзення шматаспектнага вывучэння, а таксама высвятляць прычыны сучаснага стану архіўных фондаў кансісторый і Літоўскага сінода[1]. Пры гэтым асаблівую цікавасць прадстаўляе арганізацыя архіўнай справы падчас існавання згаданых устаноў, таму што склад архіваў адлюстроўвае пазіцыю фондаўтваральнікаў, кожны з якіх з’яўляецца ўнікальным. Адпаведна, з прыцягненнем гісторыка-генетычнага метаду ў даследаванні прасочваецца развіццё нарматыўнага рэгулявання кадравай палітыкі і арганізацыі архіўнай справы ў кожным органе епархіяльнага кіраўніцтва хрысціянскіх канфесій.

Гісторыка-параўнаўчы метад выкарыстаны для выяўлення спецыфікі арганізацыі архіўнай справы ў органах епархіяльнага кіраўніцтва і дазваляе зрабіць вынікі не толькі з пазіцыі адной канфесіі, але і з пазіцыі ўсіх органаў, якія распаўсюджвалі паўнамоцтвы на вызначаных тэрыторыях. Улічваючы тое, што архіўная справа ўяўляе сабой комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на назапашванне, выкарыстанне і перадачу будучым пакаленням матэрыялаў юрыдычнай або фізічнай асобы, аб’ектамі параўнання выступілі адпаведнасць вядзення архіваў агульнадзяржаўнай і канфесіянальнай нарматыўнай базе дзейнасці, склад штатаў архіваў і патрабаванні да прызначэння асоб на вакантныя пасады, камплектаванне, арганізацыя захоўвання, правядзенне экспертызы каштоўнасці, апісанне і сістэматызацыя спраў, а таксама арганізацыя іх выкарыстання архівамі органаў епархіяльнага кіраўніцтва хрысціянскіх канфесій у канцы XVIII – пачатку XX ст. Пры гэтым нарматыўныя дакументы агульнадзяржаўнага характару прадстаўлены актамі заканадаўства як па стварэнні і арганізацыі дзейнасці кансісторый і Літоўскага сінода, так і па рэгламентацыі архіўнай справы. Канфесіянальная нарматыўная база ўвасобілася ў статутах духоўных кансісторый[2] і інструкцыях па справаводстве[3]. У матэрыялах справаводства адлюстраваны кадравы склад архіваў органаў епархіяльнага кіраўніцтва (у фармулярных спісах служачых канцылярый кансісторый, справах па іх прызначэнні і інш.), а таксама асаблівасці арганізацыі архіўнай справы (у вопісах спраў, ведамасцях, рапартах архіварыусаў і інш.), якія фарміруюць прадстаўленне аб кожным з калегіяльных органаў.

## Вынікі даследавання

У перыяд падзелаў Рэчы Паспалітай на яе тэрыторыі заставаўся толькі адзін епархіяльны цэнтр праваслаўнай царквы – Магілёўская епархія (пад кіраўніцтвам Г. Каніскага). У 1772 г. Віцебская, Полацкая і Дзвінская правінцыі былі далучаны да Пскоўскай епархіі, Магілёўская епархія была перайменавана ў Магілёўскую, Мсціслаўскую і Аршанскую епархію[4]. Паступова дзейнасць праваслаўных епархій аднаўлялася, у іх складзе ўтвараліся кансісторыі і фарміраваліся архівы. Апошняму пытанню Сінод прысвячаў шмат увагі. Так, у 1785 г. епіскапу і каад’ютару пераяслаўскаму і барыспальскаму Віктару (Садкоўскаму) указам Сінода загадвалася арганізаваць працу кансісторыі, пачаўшы з адбору штатаў. У іх склад прадпісвалася адбіраць манахаў Троіцкага манастыра, адным з асноўных патрабаванняў да якіх было веданне польскай мовы. Акрамя таго, у сувязі са зменай тэрытарыяльных

[1]Нац. гіст. арх. Беларусі (НГАБ). Ф. 136, 937, 1781, 2301, 2531, 3245, 1952 ; Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA). F. 606, 1218 ; Lietuvos nacionaline Martyno Mažvydo biblioteka. F. 93 ; Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių bibliotekos. F. 40 ; Latvijas Valsts vēstures arhīvs. F. 629.

[2]Устав духовных консисторий. СПб. : Синод. тип., 1843. 193 с. ; Устав духовных консисторий с дополнениями и разъяснениями Святейшего синода и Правительствующего сената / сост. М. Н. Палибин. СПб. : Юрид. кн. маг. Н. К. Мартынова, 1900. 232 с.

[3]LVIA. F. 694. Ap. 1. B. 1686, 1687 ; Там жа. F. 694. Ap. 1. B. 1686. P. 11v. – 13.

[4]Полное собрание законов Российской империи. Собрание первое : в 45 т. СПб. : Тип. 2-го отд-ния собств. Е. И. В. канцелярии, 1830–1851 (ПСЗРИ I). Т. 19. Ст. 13921, 13922.

меж епархіі епіскап павінен быў прыняць справы Пераяслаўскай, Магілёўскай і Кіеўскай кансісторый, якія передаваліся ў падпарадкаванне ўтворанай епархіі[5].

Справаводства праваслаўных кансісторый было арганізавана з моманту іх утварэння. Пры гэтым увага акцэнтавалася на вядзенні рэестраў уваходнай і зыходнай дакументацыі, якія ўключалі і дазвалялі ўлічваць фрагменты дакументаў, што адпавядала традыцыі калежскага справаводства[6]. Шэраг матэрыялаў трапілі ў склад архіва Мінскай праваслаўнай кансісторыі ў сувязі з затрыманнем архіепіскапа Віктара (Садкоўскага) у 1792 г. у Польшчы. Пасля вызвалення ён быў намінаваны на пасаду архіепіскапа Мінскага, Ізяслаўскага і Брацлаўскага (з 1795 г. на пасаду архіепіскапа Мінскага і Валынскага) і накіраваны ў Слуцк. Адначасова было ўзнята пытанне пра зварот архіва, што быў у архіепіскапа. Прывезены з Варшавы архіў 3 жніўня 1793 г. прыняў пісар Стэфан Сімановіч, якому дапамагалі два канцылярысты. Пісар адзначаў, што справы передаваліся па двух рэестрах на польскай і рускай мовах, але былі неўпарадкаваны. Рэестры на рускай мове былі складзены ў Пераяслаўлі, затым справы былі перададзены ў Слуцк, аднак з 9 чэрвеня да 18 красавіка 1785 г. справы нават не апісаны. У перапісцы аб лёсе архіва адзначаецца наяўнасць ранейшых варыянтаў рэестраў, што адпавядала палажэнням распаўсюджанага на беларускія землі Генеральнага рэгламенту, які прадпісваў весці рэестры і змест спраў[7]. Першы рэестр склаў перакладчык Манудзевіч[8] у пачатку жніўня 1791 г., другі – сакратар Танскі ў Варшаве[9]. Кансісторыя вельмі ўважліва паставілася да прыёму-перадачы спраў. У перадатачны рэестр увайшлі 82 справы па адміністрацыйнай дзейнасці і асабовым складзе духавенства. Таксама ў рэестры адзначалася, што атрыманы неўлічаныя справы, шэраг матэрыялаў не паступілі. Да страчаных адносіліся такія дакументы, як стаўленая грамата ўніяцкага епіскапа Афанасія Шэпціцкага, стаўленыя граматы за першую палову XVIII ст., фундушы на прызначэнне ругі. Па прадстаўленым рэестры не былі перададзены шэраг спраў маёмасна-гаспадарчага характару за XVIII ст., у тым ліку пацвярджэнні на маёмасць[10]. Пазней некаторыя запатрабаваныя справы знайшліся ў Варшаве, але яны былі ў дрэнным фізічным стане і ўключаліся ў асобны рэестр.

Пасады пратакаліста, павытчыкаў (канцылярыстаў) і архіварыуса Мінскай і Валынскай праваслаўнай кансісторыі былі ўтвораны ў выніку распараджэння ад 5 снежня 1795 г. У дакуменце таксама адзначалася, што ўсе справы павінны быць уключаны ў вопісы і рэестры. Пры гэтым кансісторыя сутыкнулася з праблемай запаўнення створанай вакансіі архіварыуса, таму што архіў не быў упарадкаваны з 1785 г. Святару Іаану Беляноўскаму было даручана разабраць справы[11]. У 1795 г. планавалася перамясціць кансісторыю ў Мінск, але для гэтага не былі падрыхтаваны памяшканні. Адначасова архіў камплектаваўся справамі з Жытомірскай кансісторыі[12]. Ордэрам Мінскай праваслаўнай кансісторыі ад 10 студзеня 1799 г. прадпісваўся парадак аператыўнага захоўвання і фарміравання спраў. Архіў першапачаткова даручаўся канцылярысту прыказнога стала Андрэю Логвінаву, але ў сувязі з напружанасцю на месцы яго непасрэднай працы 4 сакавіка передаручаны канцылярысту Гаўрыле Маркоўскаму[13]. Гэта было апраўданым крокам з улікам таго, што ў хуткім часе архівы кансісторый пачалі камплектавацца метрычнымі кнігамі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя рэарганізацыі праваслаўных епархій і адпаведныя перамяшчэнні іх архіваў працягваліся да 1840-х гг., а суаднесці іх межы з губернскімі ўдалося толькі ў пачатку ХХ ст. са стварэннем Гродзенскай епархіі[14]. У 1833 г. была адноўлена Полацкая праваслаўная епархія, адна з самых старажытных і вядомых [5, с. 93–94, 135], аднак яна была аднесена да 3-га класа і ў яе штатах таксама не было пасады архіварыуса[15].

Апошняя для першай паловы XIX ст. адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэарганізацыя адбылася ў 1840 г.[16] і супала з ліквідацыяй уніяцкай царквы і выданнем Статута духоўных кансісторый (далей – Статут), які дэталізаваў арганізацыю архіўнай справы. У перавыданні Статута 1883 г. пазначаныя падыходы не змяніліся[17]. У прыватнасці,

[5]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 20. Арк. 1 адв., 3.
[6]Там жа. Спр. 42043, 42044, 42085, 42086 і інш.
[7]Рос. гос. ист. арх. (РГИА). Ф. 1329. Оп. 1. Д. 19. Л. 707–707 об.
[8]Імя высветліць не ўдалося.
[9]Імя высветліць не ўдалося.
[10]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 288. Арк. 3–37.
[11]Там жа. Спр. 547. Арк. 2–3 ; Там жа. Спр. 186. Арк. 1.
[12]Там жа. Спр. 976. Арк. 8–9, 13–14 адв., 26 адв.
[13]Там жа. Спр. 1086. Арк. 4–6.
[14]История Брестской епархии [Электронный ресурс]. URL: pravbrest.by/история (дата обращения: 06.12.2021).
[15]Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе : в 55 т. СПб. : Тип. 2-го отд-ния собств. Е. И. В. канцелярии, 1830–1885 (ПСЗРИ II). Т. 8. Ст. 6161.
[16]ПСЗРИ II. Т. 15. Ст. 13395.
[17]Устав духовных консисторий… ; Устав духовных консисторий с дополнениями и разъяснениями Святейшего синода и Правительствующего сената…

у абедзвюх яго рэдакцыях разглядаліся пытанні фарміравання дакументаў у справы, парадку перадачы іх у архіў і стварэння ўмоў для захоўвання. Тым не менш на практыцы кожная кансісторыя самастойна вырашала арганізацыйныя пытанні. Напрыклад, у Мінскай кансісторыі дакументы захоўваліся як на палках, так і ў скрыні [6, с. 11]. Па звестках А. П. Сапунова, архіў Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі змяшчаўся ў званіцы [6, с. 7], але ўжо ў пачатку XX ст. – у пакоях на двух паверхах будынка кансісторыі. Справы былі сістэматызаваны па запатрабаванасці (метрычныя кнігі праваслаўных і ўніяцкіх цэркваў захоўваліся ў адным пакоі з выданнем «Поўны збор законаў Расійскай імперыі») і па абмежаванні доступу (сакрэтная дакументацыя захоўвалася ў асобнай шафе, найбольш старажытныя дакументы 1575–1820 гг. – у скрыні), што адпавядала дзеючаму заканадаўству. На ніжнім паверсе захоўваліся рэгістрацыйна-ўліковыя матэрыялы, архіўная, уліковая, распарадчая дакументацыя дзяржаўных органаў і Сінода, а таксама кліравыя ведамасці (даныя па асабовым складзе духавенства)[18]. Аднак у справаздачы аб стане Магілёўскай епархіі за 1908 г. адзначалася, што архіў знаходзіўся на паўпадвальным паверсе, сухім і бяспечным ад агню[19]. Даведачны апарат абмяжоўваўся храналагічным рэестрам і алфавітным паказальнікам[20]. Апошняе набывае актуальнасць з ростам дакументаабароту, асабліва па зваротах прыватных асоб. Напрыклад, у Мінскай праваслаўнай кансісторыі на пачатак 1817 г. па прашэннях прыватных асоб не завершанымі справаводствам заставаліся 64 справы, на працягу года паступілі 313 спраў, а да 1 студзеня 1818 г. трэба было вырашыць 103 справы. Аналагічна ўзрасла колькасць судова-следчых спраў (з 26 у 1817 г. да 57 у 1818 г.). За год паступілі 86 спраў[21]. Пры гэтым у Статуце не былі акрэслены падыходы да экспертызы каштоўнасці дакументаў, што прыводзіла да павелічэння фізічных аб'ёмаў архіва і складанасцей у арганізацыі яго выкарыстання.

У 1842–1843 гг. таксама быў вызначаны штат праваслаўных кансісторый 1-га і 2-га класаў, у які асобна ўключалася пасада архіварыуса з заробкам у памеры 200 руб. Архіварыусам Мінскай кансісторыі стаў Кіпра Сускі[22]. У хуткім часе ён звярнуўся да Сінода з просьбай аб прызначэнні памочніка, які б валодаў польскай мовай[23]. На працягу ўсяго існавання кансісторыі сутыкаліся з праблемамі камплектавання штатаў архіваў з-за невялікіх заробкаў і неадпаведнай падрыхтоўкі, што было звязана ў тым ліку з перавагай, якая аддавалася святарскім дзецям пры фарміраванні штатаў[24]. Сітуацыя абвастрылася з пачаткам Першай сусветнай вайны. Кадравыя складанасці архіва, напрыклад Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі, апісаны ў яго рэвізіі за 1917 г., дзе адзначана, што ў 1916 г. справы не перадаваліся па прычыне прызыву служачых на вайну[25].

Акрамя выканання непасрэдных абавязкаў, архіварыус фіксаваў пашкоджанні спраў, якія перадаваліся з падначаленых устаноў. Так, архіварыус Мінскай кансісторыі адзначаў, што з 25 метрычных кніг, якія перадаваліся з ведання трэцяга стала кансісторыі, 3 мелі пашкоджанні шнура і пячаткі, у дрэнным стане былі перададзены метрычныя кнігі Юркоўскай царквы за 1828–1834 гг.[26] Пашкоджанні былі абумоўлены не толькі інтэнсіўным выкарыстаннем кніг у архіве кансісторыі, але і ўмовамі іх перамяшчэння і захоўвання. Напрыклад, у архіве Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі ў пачатку XX ст. захоўваліся 2602 справы Беларускай кансісторыі за 1800–1841 гг.[27] Акрамя іх, у архіве кансісторыі меліся справы епіскапаў Іаана Красоўскага, Якава Мартусевіча і Васілія Лужынскага, адміністратара Ісаі Шулякевіча[28] [7].

Статут таксама прадугледжваў апісанне і сістэматызацыю спраў. Для вырашэння гэтых задач у некаторыя кансісторыі прыцягваліся супрацоўнікі епархіяльных семінарый і дасведчаныя святары, як адбывалася, напрыклад, у Наўгародскай епархіі ў 1869 г. (у канцы XIX – пачатку XX ст. гэту працу працягнуў яе архіварыус М. Нікольскі) [4, с. 172–173]. У беларускіх кансісторыях апісанне і даследаванне архіваў ажыццяўляліся створанымі ў 1830–60-я гг. статыстычнымі камітэтамі, якіх цікавіла старажытная частка архіваў, а таксама архіварыусамі. Так, пры апісанні архіва Мінскай праваслаўнай кансісторыі член Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта А. П. Сапуноў адзначаў, што прысутнічаюць толькі 6 кніг вопісаў, якія ахопліваюць найбольш старажытную частку архіва з 1742 г. [6, с. 11]. Верагодна, яны былі складзены ў 1840-я гг. пад уздзеяннем патрабаванняў Статута. Аднак архіў змяшчаў

---

[18]НГАБ. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 5–6.
[19]Там жа. Спр. 139. Арк. 17–56.
[20]Устав духовных консисторий… Ст. 347–356.
[21]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 4698. Арк. 2.
[22]Там жа. Спр. 16310. Арк. 6 адв., 13–16.
[23]Там жа. Спр. 15691.
[24]ПСЗРИ I. Т. 23. Ст. 17161.
[25]НГАБ. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 845. Арк. 1–1 адв.
[26]Там жа. Спр. 34. Арк. 14–15 адв.
[27]Там жа. Спр. 1. Арк. 1–4.
[28]Там жа.

таксама шэраг неапісаных спраў [6, с. 11]. На матэрыялах, якія захоўваліся ў архіве Полацкай епархіі, два значныя даследаванні падрыхтаваў А. П. Сапуноў [5; 8]. Архіў Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі быў упарадкаваны яе сакратаром В. А. Александровічам у 1889–1900 гг. А. П. Сапуноў адзначаў, што падчас яго наведвання апошняй са згаданых кансісторый у архіве працаваў дацэнт Кіеўскай духоўнай акадэміі Ф. І. Цітоў [6, с. 7]. У канцы XIX – пачатку XX ст. пад уздзеяннем развіцця методыкі архіўнай справы ў Расійскай імперыі, а таксама зыходзячы з грамадскай цікавасці склаўся навукова-даведачны апарат кансісторый. У прыватнасці, ён быў прадстаўлены алфавітамі, у аснове якіх ляжала храналагічна-алфавітная прыкмета. Яны ўключалі дату і нумар справы, яе змест і адзнакі, як у Магілёўскай кансісторыі[29].

З шэрагам аналагічных праблем захоўвання матэрыялаў уласнай дзейнасці сутыкнуліся кансісторыі ўніяцкай царквы, нягледзячы на іх існаванне да 1839 г. У адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Расійскай імперыі кансісторыі з'яўляліся дарадчымі калегіяльнымі органамі пры іерарху[30], таму вельмі цікавая сітуацыя склалася ў 1780–1784 гг. у Беларускай (Полацкай) кансісторыі. Калі яна была ўтворана[31], полацкі ўніяцкі арцыбіскуп Ясон Смагаржэўскі быў пазбаўлены расійскага падданства. Іраклій Лісоўскі быў прызначаны на гэту пасаду толькі ў 1784 г. Епархіяй кіравала кансісторыя. Яе паўнамоцтвы былі абмежаваны дзяржаўнымі ўладамі да вырашэння кадравых пытанняў ніжэйшага кліру. Напрыклад, калі пасада святара царквы была вакантнай, у прыхаджан высвятлялі, якога святара яны жадаюць – праваслаўнага або ўніяцкага. У апошнім выпадку яго прызначала кансісторыя [5, с. 117]. У 1795 г. ліквідаваны Полацкая, Мінская і Віленская епархіі [5, с. 119], затым з чатырох уніяцкіх епархій (Луцкай, Брэсцкай, Віленскай і Полацкай) утвораны дзве – Беларуская і Літоўская (з перадачай дакументаў папярэднікаў) [5, с. 135].

Рэвізіі дзейнасці кансісторый, у тым ліку арганізацыі архіўнай справы, рэдка ініцыіраваліся. Адна з рэвізій ажыццяўлялася па даручэнні імператара Аляксандра І уніяцкім мітрапалітам Іасафатам Булгакам з неафіцыйнай мэтай праверкі скаргаў на епіскапа Іаана Красоўскага [9, с. 50]. Па выніках рэвізіі яму было прадпісана вярнуцца з маёнтка Судзіловічы, дзе ён знаходзіўся з 1812 г., у маёнтак Струнь разам з кансісторыяй. Яго папярэднік мітрапаліт Іраклій Лісоўскі знаходзіўся ў в. Студзенец Мсціслаўскага павета. У 1780–1806 гг. кансісторыя была ў Ануфрыеўскім архімандрыцкім (базыльянскім) манастыры [9, с. 30, 51]. Нягледзячы на планы перамяшчэння органаў епархіяльнага кіраўніцтва ў Полацк, да канца існавання кансісторыя знаходзілася ў маёнтку Струнь. В. Лужынскі пачаў сваю дзейнасць у Беларускай уніяцкай епархіі ў 1833 г. менавіта з яе рэвізіі [9, с. 50]. Справаводства і архіўная справа ў Беларускай кансісторыі адпавядала патрабаванням Генеральнага рэгламенту па арганізацыі захоўвання спраў і складання архіўнай дакументацыі. Таксама вяліся рэестры ўваходнай і зыходнай дакументацыі з капіраваннем дакументаў, што павышала інфармацыйны патэнцыял матэрыялаў, улічваючы іх рассеянасць пераважна паміж архівамі праваслаўных кансісторый пасля ліквідацыі ўніяцкіх[32].

У лютым 1839 г. адбыліся дзве падзеі, якія паўплывалі на архівы Беларускай і Літоўскай уніяцкіх кансісторый. Спачатку цэрквы Валынскай і Кіеўскай губерняў, якія ўваходзілі ў Беларускую епархію, перайшлі ў склад Літоўскай епархіі[33], пры гэтым справы перададзены не былі. Наступнай падзеяй стаў Полацкі царкоўны сабор. Пасля ліквідацыі кансісторый лёсы іх архіваў вырашаў Сінод[34]. У адпаведнасці з вопісам спраў, складзеным у 1841 г., у архіве Беларускай кансісторыі налічваліся 1689 спраў, 782 з іх у 1828–1841 гг. былі перададзены ў Літоўскую кансісторыю[35]. Метрычныя кнігі ліквідаваных уніяцкіх цэркваў падначаленых тэрыторый, копіі і экстракты з іх (звыш 1000 спраў) у пачатку XX ст. захоўваліся ў архіве Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі[36].

У рымска-каталіцкіх дыяцэзіях, як і ў іншых інаслаўных канфесіях, дзейнасць архіваў першапачаткова рэгламентавалася на канфесіянальным узроўні. На агульнадзяржаўным узроўні акрэсліваліся паўнамоцтвы іерархаў і ўтвараліся кансісторыі. Гэта відавочна з першых дакументаў. Так, рымска-каталіцкаму біскупу, які яшчэ не быў прызначаны ў 1772 г., было даручана кіраваць царквой і прадпісана абапірацца на рэгламент 1769 г., аднак у апошнім адсутнічалі звесткі пра ўтварэнне калегіяльнага органа – кансісторыі, таму ўказ утрымліваў адпаведныя звесткі[37]. У 1773 г. арцыбіскупам стаў С. Богуш-Сестранцэвіч, яго рэзідэнцыяй і месцам знаходжання кансісторыі прызначаны Магілёў. Пры гэтым арцыбіскуп

[29]НГАБ. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 54.
[30]ПСЗРИ І. Т. 19. Ст. 13922.
[31]Там жа. Ст. 15028.
[32]НГАБ. Ф. 3245. Воп. 1. Спр. 54.
[33]ПСЗРИ ІІ. Т. 14. Ст. 11995.
[34]Там жа. Ст. 12467.
[35]НГАБ. Ф. 3245. Воп. 1. Спр. 51 ; LVIA. F. 634. Ap. 1. P. 15v.
[36]НГАБ. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1–4.
[37]ПСЗРИ І. Т. 19. Ст. 13922.

асабіста вызначаў склад кансісторыі[38] і актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі справаводства. Адпаведна, ён вызначаў і склад канцылярыі з трох канцылярыстаў. Пасады архіварыуса пры гэтам не было[39].

У 1782–1783 гг. былі створаны Магілёўскае арцыбіскупства і кансісторыя (колькасць членаў не вызначана)[40], прызначаны каад'ютар Ян Беніслаўскі. Цікава, што ў 1797 г. арцыбіскуп, як і праваслаўныя іерархі, збіраў звесткі пра вырашаныя і нявырашаныя кансісторыяй справы за подпісам сакратара або архівіста[41], хаця асобная пасада апошняга з'явілася толькі ў 1840-я гг[42]. У 1800 г. у Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі былі ўведзены настольны (паводле храналагічнай прыкметы) і дакладны рэестры[43].

У 1798 г. быў вызначаны склад кансісторыі ў кожнай з утвораных дыяцэзій, у тым ліку ў Мінскай і Віленскай: афіцыял (генеральны вікарый), віцэвікарый і асэсары. Склад канцылярыі не вызначаўся[44]. Вядома, што ў 1823–1831 гг. аб архіве Магілёўскай кансісторыі клапаціўся Ян Ляхавіцкі, а з ростам дакументаабароту ў сярэдзіне XIX ст. архіварыус атрымаў памочнікаў з ліку канцылярыстаў [10, с. 53]. Кансісторыя змяшчалася ў арандаваным доме Шаі Шура ў 1845–1848 гг., затым у арганізаваным доме Гіршы Аранзона ў Магілёве. У 1873 г. кансісторыя была перанесена ў Санкт-Пецярбург па адрасе вул. Фантанка, 118. У 1883 г. архіў Магілёўскай кансісторыі папоўніўся матэрыяламі дзейнасці Мінскай кансісторыі (што з 1869 г. знаходзіліся ў Вільні), бо яна была адміністрацыйна падначалена Віленскай кансісторыі. Падчас сваёй дзейнасці Мінская кансісторыя змяшчалася ў Мінску на вул. Францысканскай, у 1856 г. было вырашана набыць для яе дом графа Тызенгаўза [10, с. 51–52].

Унёсак у развіццё архіўнай справы ў рымска-каталіцкіх кансісторыях належыць камісіям па разборы актавых і метрычных кніг у заходніх губернях, хаця яны ствараліся ў іншых мэтах. У прыватнасці, камісіі інспектавалі афармленне спраў па рэгістрацыі грамадзянскага стану[45], аднак у архівах кансісторый гэта распаўсюдзілася таксама на іншыя віды спраў [10, с. 52–53].

Павелічэнне аб'ёмаў справаводства ўзняло пытанне адбору спраў для пастаяннага захоўвання альбо знішчэння. У 1854 г. быў распрацаваны парадак разбору і знішчэння архіваў Міністэрства ўнутраных спраў, якому падпарадкоўваліся іншаслаўныя канфесіі. У 1860 г. была ініцыіравана распрацоўка аналагічных дакументаў для кансісторый[46]. У праваслаўнай царкве падобныя рашэнні прымаліся Сінодам. У выніку абмеркавання ў рымска-каталіцкіх кансісторыях фарміраваўся цэласны архіў, за выключэннем пераважна спраў з паўтаральнай інфармацыяй (фармулярныя спісы духавенства, выпісы з метрычных кніг аб народжаных, шлюбаваных і памерлых, рэгістрацыйна-ўліковыя формы дакументаў і інш.) [11].

Адзначаныя тэндэнцыі, а таксама вопыт справаводцаў і архівістаў грамадзянскіх і канфесіянальных устаноў першай трэці XIX ст. адлюстраваны ў інструкцыях па справаводстве і дзейнасці рымска-каталіцкіх кансісторый, выдадзеных у 1840-я гг.[47] У адпаведнасці з першай з іх удасканаліўся ўлік спраў у архівах, стварыўся навукова-даведачны апарат, сістэматызацыя спраў у архіве набыла структурна-храналагічную прыкмету[48].

Падставовымі дакументамі па ўліку спраў і архіўнымі даведнікамі ў другой палове XIX ст. з'яўляліся вопісы спраў, складзеныя як у справаводстве кансісторый (агульны вопіс спраў стала, вопіс спраў, прызначаных для перадачы ў архіў), так і ў іх архівах (агульны рэестр спраў архіва). Пры гэтым фармуліраваліся кароткія і групавыя загалоўкі. Сярод улікова-даведачных дакументаў неабходна адзначыць агульны (храналагічны) рэестр спраў, які ўключыў усе справы Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі за 1822–1843 гг.[49] Пра ўліковую вартасць гэтага віду даведнікаў сведчыць той факт, што архіварыус Магілёўскай кансісторыі Адам Непакойчыцкі ў 1856 г. прымаў па ім справы ў сферы паўнамоцтваў першага стала, пазней у рэестры былі зроблены адзнакі пра лёс архіўных дакументаў (напрыклад, матэрыялы за 1467 г. і XVIII ст. значна пацярпелі ад пажару 1847 г. у Магілёве[50]). Іншым відам даведнікаў сталі алфавіты, асабліва запатрабаваныя з ростам дакументаабароту кансісторый. У кансісторыях яны ўключалі ўсе справы, якія

[38]ПСЗРИ I. Т. 19. Ст. 14073, 14122.
[39]НГАБ. Ф. 1781. Воп. 2. Спр. 2220. Арк. 32.
[40]ПСЗРИ I. Т. 21. Ст. 15326, 15876.
[41]НГАБ. Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1. Арк. 1–1 адв.
[42]Directorium horarum canonicrum et missarum ad usus utriusqur cleriArchi-Diaecesis Mohileviensis in annum domini MDCCCXLIII. Mohilevie : Typis pulatii metropolitani Rom Catholic, 1843.
[43]НГАБ. Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1. Арк. 235–236 адв.
[44]ПСЗРИ I. Т. 25. Ст. 18504.
[45]НГАБ. Ф. 3124. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 2–3 адв., 179–185.
[46]ПСЗРИ II. Т. 29. Ст. 28529.
[47]LVIA. F. 694. Ap. 1. B. 1686.
[48]Там жа. Ар. 11v. – 13.
[49]НГАБ. Ф. 1781. Воп. 32. Спр. 189.
[50]Там жа. Воп. 28. Спр. 265. Арк. 1.

сістэматызаваліся па гадах у алфавітным парадку[51]. Нягледзячы на тое што апісанне спраў уваходзіла ў абавязкі архіварыуса, пры неабходнасці маглі наймаць пазаштатных асістэнтаў, напрыклад як у 1883 г. [10, с. 54]. Гэтыя даведнікі выкарыстоўваліся пераважна супрацоўнікамі канцылярыі. Адзіным з вядомых даследчыкаў, які быў дапушчаны да працы з архівам Магілёўскай кансісторыі, быў обер-пракурор Сінода і член Дзяржаўнага савета Д. А. Талстой, які падрыхтаваў на аснове архіўных матэрыялаў двухтомнае выданне [12].

Органы епархіяльнага кіраўніцтва евангелічных канфесій у канцы XVIII – першай трэці XIX ст. захоўвалі пэўную аўтаномнасць і перыядычна кіраваліся дзеючымі органамі (сінодамі)[52]. У канфесіянальнай сферы яны карысталіся ўласнымі нарматыўнымі дакументамі, але ў арганізацыі справаводства і архіваў – агульнадзяржаўнымі. Тым не менш арганізацыйным аспектам таксама надавалася шмат увагі, хаця канфесіянальная дакументацыя цалкам не адлюстроўвае гэта[53]. Так, у 1806 г. увагу дзяржаўных улад прыцягнула дзейнасць Курляндскай кансісторыі. Пасяджэнні там адбываліся двойчы ў год (у маі і кастрычніку) і цягнуліся па 14 дзён, астатні час ёю адзінаасобна кіраваў канцлер, што было недапушчальна для калегіяльнага органа. У астатніх кансісторыях, у тым ліку ў Віленскай, прысутнічалі як мінімум тры члены (домпробст і два асэсары), штогадова яна збіралася, хаця парушэнні дзейнасці ў яе таксама назіраліся[54]. У штатах евангелічных кансісторый 1822 г. не пазначаны архіварыус, пры гэтым склад канцылярыі прадстаўлены сакратаром, натарыусам, канцылярыстам і прыслужнікам[55]. Пасля далучэння ў 1830 г. акругі Віленскай кансісторыі, у веданні якой былі абшчыны беларускіх губерній, да Курляндскай у штат апошняй уключылі перакладчыка[56]. Наступныя змены тычыліся складу прысутнасці кансісторыі, але не складу яе канцылярыі[57].

З прыняццем статута пратэстанцкіх (евангелічна-лютэранскіх і евангелічна-рэфарматарскіх) цэркваў пэўная ўвага была нададзена справаводству і архіўнай справе, асабліва ў дачыненні да перапіскі з вышэйшымі ўстановамі, пратакольнай і судовай дакументацыі. Аднак у штатах Курляндскай кансісторыі па-ранейшаму адсутнічаў архіварыус. Справаводства вялося на нямецкай мове, прашэнні і перапіска – на рускай або нямецкай[58]. Рэфарматарскія абшчыны былі менш распаўсюджаны, і іх лёсы маглі вырашацца індывідуальна, як у 1824 г. для капыскай абшчыны, што з непасрэднага ведання юстыц-калегіі перадавалася Літоўскаму евангелічна-рэфарматарскаму сіноду[59].

## Заключэнне

Такім чынам, дзейнасць архіваў органаў епархіяльнага кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. рэгламентавалася пераважна на канфесіянальным узроўні. Агульнадзяржаўныя нарматыўныя акты, да якіх адносіцца ў першую чаргу Генеральны рэглемент, змяшчалі агульныя патрабаванні да забеспячэння захоўвання і ўліку дакументаў. Падзаконныя нарматыўна-метадычныя дакументы адсутнічалі. У адпаведнасці са зменамі нарматыўнага рэгулявання можна вылучыць два агульных для ўсіх калегіяльных органаў кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі перыяды развіцця архіўнай справы. Гэтыя перыяды звязаны з прыняццем Статута духоўных кансісторый для праваслаўнай царквы, а таксама з распрацоўкай інструкцый па справаводстве кансісторый для інаслаўных цэркваў у 1840-я гг. У першы перыяд дзейнасці кансісторый на іерархаў ускладаліся абавязкі па вырашэнні арганізацыйных пытанняў – ад месца захоўвання архіва і яго штатаў да ўліку спраў і стварэння навукова-даведачнага апарату. Пасада архіварыуса адсутнічала ў штатах усіх кансісторый, яго абавязкі ўскладаліся на аднаго са служачых канцылярыі. Пры гэтым у праваслаўных кансісторыях пры падборы супрацоўнікаў перавага аддавалася дзецям прадстаўнікоў духавенства, якія навучаліся ў семінарыі. У інаслаўных кансісторыях архіварыусамі станавіліся прыватныя асобы, значным аргументам на карысць якіх было веданне моў справаводства. У гэты перыяд іерархі актыўна ўдзельнічалі ў размеркаванні абавязкаў паміж супрацоўнікамі канцылярый і захоўванні матэрыялаў уласнай дзейнасці. З удасканаленнем штатаў кансісторый і ростам дакументаабароту роля епіскапаў у вырашэнні арганізацыйных пытанняў іх дзейнасці, да якіх

[51] Устав духовных консисторий… Ст. 355 ; LVIA. F. 694. Ap. 1. B. 1686. P. 11v–13v ; НГАБ. Ф. 1781. Воп. 34. Спр. 1, 15, 16, 18 і інш.
[52] ПСЗРИ I. Т. 7. Ст. 4782.
[53] LVIA. F. 606, 1218 ; Lietuvos nacionaline… F. 93 ; Lietuvos mokslų…. F. 40 ; Latvijas Valsts… F. 629.
[54] ПСЗРИ I. Т. 29. Ст. 22306.
[55] Там жа. Ст. 28974.
[56] ПСЗРИ II. Т. 6. Ст. 4481.
[57] Полное собрание законов Российской империи. Собрание третье : в 33 т. СПб. : Тип. II отд-ния собств. Е. И. В. канцелярии, 1884–1913 (ПСЗРИ III). Т. 11. Ст. 7498, 7514 ; Т. 32. Ст. 37237.
[58] ПСЗРИ II. Т. 7. Ст. 5870, № 290–308.
[59] ПСЗРИ I. Т. 39. Ст. 29868.

адносілася архіўная справа, зніжаецца. На дзейнасць архіваў паўплывала і міністэрская рэформа. Непасрэдна архівы захоўваліся ў бяспечных умовах, але на іх захаванасць значна ўздзейнічалі фактары аб'ектыўнага характару (частыя перамяшчэнні ў сувязі з адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем, зменамі іерархаў, вайна). Перадача спраў па прыналежнасці тэрыторый патрабавала іх уліку ў рэестрах пераважна па храналагічнай прыкмеце, аднак шэраг прыкладаў сведчаць пра тое, што перадаваліся не ўсе справы. Алфавітныя рэестры, як элемент даведачнага апарату архіваў, у гэты перыяд не складаліся.

У 1840-я гг. патрабаванні да размяшчэння архіваў не змяніліся, але пад уплывам росту дакументаабароту і неабходнасці арганізацыі выкарыстання архіўных дакументаў на канфесіянальным узроўні ў даведачных мэтах была сфарміравана падсістэма архіўнай дакументацыі і вызначаны патрабаванні да яе вядзення, што таксама было абумоўлена развіццём даследаванняў у галіне архіўнай справы. У кансісторыях з'явілася пасада архіварыуса, а ў канцы XIX – пачатку XX ст. з'явіліся пасады пастаянных і часовых памочнікаў. Апошнія наймаліся на перыяд апрацоўкі значных аб'ёмаў дакументацыі. Сістэматызацыя спраў у вопісах ажыццяўлялася пераважна па структурна-храналагічнай прыкмеце, быў сфарміраваны склад уліковых і навукова-даведачных дакументаў, ажыццяўлялася экспертыза каштоўнасці матэрыялаў. У сувязі са зменай узроўню рэгламентацыі архіўнай справы ў кансісторыях для кожнай з іх можна вылучыць уласныя этапы дзейнасці і сваю спецыфіку архіваў. Напрыклад, з-за ліквідацыі ўніяцкіх кансісторый праваслаўныя набылі новыя крыніцы камплектавання, прымаючы на захоўванне матэрыялы дзейнасці азначаных устаноў. У рымска-каталіцкіх кансісторыях у канцы XIX ст. актыўна распрацоўваўся навукова-даведачны апарат, з архіваў ліквідаваных уніяцкіх устаноў фарміраваўся аб'ёмны архіўны комплекс Магілёўскай кансісторыі. Спецыфікай евангелічных органаў епархіяльнага кіраўніцтва з'яўляецца іх поўная аўтаномнасць. Адпаведна, можна сцвярджаць, што архіўная справа ў органах канфесіянальнага кіраўніцтва хрысціянскіх канфесій у канцы XVIII – пачатку XX ст. адпавядала дзеючаму заканадаўству Расійскай імперыі, а ўвага канфесіянальнага кіраўніцтва, нягледзячы на шэраг страт, абумоўленых аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі фактарамі, дазволіла захаваць значныя дакументальныя комплексы высокага інфармацыйнага патэнцыялу.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Олевская ВВ. К вопросу о становлении московского епархиального управления в начальный синодальный период. *Вестник Православного Свято-Тихоновского гуманитарного университета. Серия 2. История. История Русской православной церкви.* 2009;32:7–17.

2. Старостин ЕВ. Архив Русской православной церкви. X–XX века (исторический очерк). В: Безбородов АА, редактор. *Труды Историко-архивного института. Том 36. Архивы Русской православной церкви: пути из прошлого в настоящее.* Москва: РГГУ; 2005. с. 20–29.

3. Иванов ИО. Развитие архива Московской духовной консистории в первой половине XVIII в. *Вестник Православного Свято-Тихоновского гуманитарного университета. Серия 2. История. История Русской православной церкви.* 2021;101:46–63. DOI: 10.15382/sturII2021101.46-63.

4. Снытко ОВ. Архив Новгородской духовной консистории: история, проблемы создания научно-справочного аппарата. *Вестник ПСТГУ. Серия II. История. История Русской православной церкви.* 2005;18:171–196.

5. Сапунов АП. *Исторические судьбы Полоцкой епархии с древнейших времен до половины XIX века*. Витебск: Типография Губернского правления; 1889. 172 с.

6. Сапунов АП. *Архивы в городах Могилёв. губ. и Минске*. Москва: Печатня А. И. Снегиревой; 1902. 14 с.

7. Антановіч ЗВ. Архіў Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі: уласцівасці фарміравання, захаванасць, склад дакументаў (па матэрыялах архіўнага фонду 2301 «Магілёўская духоўная праваслаўная кансісторыя Сінода» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі). У: Адамушка УІ, Бохан ЮМ, Галенчанка ГЯ, Голубеў ВФ, Дзянісаў УМ, Лісейчыкаў ДВ і інш., рэдактары. *Архіварыус. Выпуск 14.* Мінск: НГАБ; 2016. с. 14–33.

8. Сапунов АП. *Витебская старина. Том 5. Материалы для истории Полоцкой епархии.* Витебск: Типография Губернского правления; 1888. 447 с.

9. Лужинский В. *Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого*. Казань: Типография Императорского университета; 1885. 312 с.

10. Антановіч ЗВ. *Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.).* Мінск: Экоперспектива; 2016. 226 с.

11. Антановіч ЗВ. «Разбор дакументаў» у архіве Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі). У: Галенчанка ГЯ, Голубеў ВФ, Дзянісаў УМ, Кураш ВІ, Лісейчыкаў ДВ, Матвейчык ДЧ і інш., рэдактары. *Архіварыус. Выпуск 16.* Мінск: НГАБ; 2018. с. 5–14.

12. Толстой ДА. *Римский католицизм в России.* Санкт-Петербург: Типография В. Ф. Демакова; 1876. 2 тома.

## References

1. Olevskaya VV. [In the matter of the Establishment of the Moscow Diocesan Department during its early Synodal Period]. *Vestnik Pravoslavnogo Svyato-Tikhonovskogo gumanitarnogo universiteta. Seriya 2. Istoriya. Istoriya Russkoi pravoslavnoi tserkvi*. 2009;32:7–17. Russian.

2. Starostin EV. [Archive of the Russian Orthodox Church. 10$^{th}$–20$^{th}$ centuries (historical essay)]. In: Bezborodov AA, editor. *Trudy Istoriko-arkhivnogo instituta. Tom 36. Arkhivy Russkoi pravoslavnoi tserkvi: puti iz proshlogo v nastoyashchee* [Proceedings of the Historical and Archival Institute. Volume 36. Archives of the Russian Orthodox Church: paths from the past to the present]. Moskow: Russian State University for the Humanities; 2005. p. 20–29. Russian.

3. Ivanov IO. Development of the Archive of the Moscow Theological Consistory in the first half of the 18$^{th}$ century. *Vestnik Pravoslavnogo Svyato-Tikhonovskogo gumanitarnogo universiteta. Seriya 2. Istoriya. Istoriya Russkoi pravoslavnoi tserkvi*. 2021;101:46–63. Russian. DOI: 10.15382/sturII2021101.46-63.

4. Snytko OV. [The Archives of Novgorod Theological Consistory: history, problems of creating apparatus criticus]. *Vestnik PSTGU. Seria II. History. History of Russian Orthodox Church.* 2005;18:171–196. Russian.

5. Sapunov AP. *Istoricheskie sud'by Polotskoi eparkhii s drevneishikh vremen do poloviny XIX veka* [Historical destinies of the Polotsk diocese from ancient times to the middle of the 19$^{th}$ century]. Vitebsk: Tipografiya Gubernskogo pravleniya; 1889. 172 p. Russian.

6. Sapunov AP. *Arkhivy v gorodakh Mogilev. gub. i Minske* [Archives in the cities of gubernia' Mogilev and Minsk]. Moscow: Pechatnya A. I. Snegirevoi; 1902. 14 p. Russian.

7. Antanovich ZV. The Archive of Mahiliow Orthodox Consistory: features of formation, preservation, composition (based on archival fond 2301 «Mahiliow Orthodox consistory of Synod» of the National Historical Archives of Belarus). In: Adamushka UI, Bohan JuM, Galenchanka GJa, Golubew VF, Dzjanisaw UM, Lisejchykaw DV, et al., editors. *Archivaryus. Volume 14*. Minsk: Nacyjanal'ny gistarychny arhiw Belarusi; 2016. p. 14–33. Belarusian.

8. Sapunov AP. *Vitebskaya starina. Tom 5. Materialy dlya istorii Polotskoi eparkhii* [Vitebsk antiquity. Volume 5. Materials for the history of the Polotsk diocese]. Vitebsk: Tipografiya Gubernskogo pravleniya; 1888. 447 p. Russian.

9. Luzhinskii V. *Zapiski Vasiliya Luzhinskogo, arkhiepiskopa Polotskogo* [Notes of Vasily Luzhinsky, Archbishop of Polotsk]. Kazan: Tipografiya Imperatorskogo universiteta; 1885. 312 p. Russian.

10. Antanovich ZV. *Arhivy Magiljowskaj i Minskaj rymska-katalickih kansistoryj: gistoryja, struktura, sklad dakumentaw (1782–1918 gg.)* [Archives of the Mogilev and Minsk Roman Catholic consistories: history, structure, composition of documents (1782–1918)]. Minsk: Ekoperspektiva; 2016. 226 p. Belarusian.

11. Antanovich ZV. [«Analysis of documents» in the archives of the Mahilioŭ Roman Catholic Consistory (based on the materials of the National Historical Archives of Belarus)]. In: Galenchanka GJa, Golubew VF, Dzjanisaw UM, Kurash VI, Lisejchykaw DV, Matvejchyk DCh, et al., editors. *Arhivaryus. Vypusk 16*. Minsk: Nacyjanal'ny gistarychny arhiw Belarusi; 2018. p. 5–14. Belarusian.

12. Tolstoy DA. *Rimskii katolitsizm v Rossii* [Roman Catholicism in Russia]. Saint Petersburg: Tipografiya V. F. Demakova; 1876. 2 volumes. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 19.02.2022.*
*Received by editorial board 19.02.2022.*